УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)
Г 51

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Рэдакцыйная калегія: У.В. Тугай (галоўны рэдактар), С.П. Барадзін, Дз.У. Дубінін, А.П. Жытко, У.У Куніцкі, А.І. Малюгін, А.М. Люты, А.Ф. Рацько, В.М. Фамін, А.А. Цобкало, Л.Л. Шкуцько

Рэцэнзенты: У.М. Міхнюк, доктар гістарычных навук, прафесар
А.А. Яноўскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Г 51 Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. Канф., 28 лістапада 2003 г.; Рэдкал.: У.В. Тугай (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БДПУ, 2003.-с. 252.

Асвятляюцца актуальныя пытанні гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзен, гістарыяграфія гісторыі славянскіх народаў а таксама гістарыяграфія ўсеагульнай гісторыі. Прызначаецца навукоўцам і выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)

ISBN 985-435-155-6 (ч. 1)

© БДПУ імя М. Танка, 2003

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ГІСТОРЫІ

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі
28 лістапада 2003 года

У 3-х частках

Частка 1

Мінск
2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ПІСЬМЙННАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Х-ХІІІ СТСТ. ПА ЭПІГРАФІЧНЫХ ДАНЫХ

І.Л.Калечыц
г. Мінск

Эпіграфіка - дапаможная гістарычная і філалагічная дысцыпліна, якая вывучае змест і формы надпісаў, нанесеных на рэчы (пячаткі, абразкі, прасліцы, манеты, званы, мячы, клінкі і інш.) або натуральныя ці штучныя паверхні (камяні, скалы, каменныя крыжы, сцены пабудоў і інш.) [2, 666]

Эпіграфіка цесна звязана з такімі дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі як палеаграфія, сфрагістыка, нумізматыка. Найбольш цесныя сувязі ў эпіграфікі з палеаграфіяй, але яны адрозніваюцца тым, што эпіграфіка ўзаемна вывучае прадмет і надпіс на ім, а палеаграфічны і гістарычны аналіз – неабходная ўмова даследавання. У адрозненні ад гістарычнай граматыкі, каштоўнымі для эпіграфічных даследаванняў з'яўляюцца нават самыя фрагментарныя надпісы (у тым ліку і асобныя літары).

Эпіграфіка дазваляе даследаваць пісьмйннасць насельніцтва Беларусі Х-ХІІІ стст. таму, што нават самыя нязначныя надпісы нанасіліся спантанна самымі рознымі прадстаўнікамі гарадскога насельніцтва, у адрозненне ад летапісаў, якія з пэўнымі мэтамі вяліся адукаванымі людзьмі.

Матэрыял эпіграфічных даследаванняў ўмоўна можна падзяліць на графіці на манументальных пабудовах і даволі значную частку – археалагічны матэрыял з надпісамі. Важкім матэрыялам для вывучэння пісьмйннасці насельніцтва Беларусі з'яўляюцца спецыфічныя прылады для пісьма Х-ХІІІ стст. на славянскіх землях – пісалы і цэры, таксама здабыткі археалагічных раскопак.

Цікавасць да эпіграфічных помнікаў узнікла яшчэ ў эпоху Адраджэння. І ў першую чаргу яна датычылася прадметаў, якія прывабліваліда сабе ўвагу вучоных сваёй нязвыкласцю. Упершыню ў "Хроніке Польскай, Літоўскай і Жамойцкай" былі апісаны Мацеем Стрыйкоўскім так званыя Барысавы камяні. Стрыйкоўскі асабіста агледзіў адзін з камянеў, але перадаў надпіс так, як чуў яго ад нейкага купца з Дзісны. Недастаткова дакладна, але важна, што ён палічыў неабходным растлумачыць надпіс на помніке. [19, 241]

Да XVI ст. адносяцца звесткі аб крыжы Еўфрасінні Полацкай. Яны знаходзяцца ў Ніканаўскім летапісе, дзе прыводзіцца гісторыя перамяшчэння крыжа з Полацка ў Маскву і частка надпіса. Цікава, што менавіта заклядце



на крыжы ўразіла летапісца, што дазволіла яму перадаць яго змест даволі дакладна. [1, 11]

Новы ўсплёск цікавасці да эпіграфічных помнікаў пачынаецца са знаходкай Тмутараканскага камня. Пасля апублікавання звестак пра яго стаў вядомы таксама і Рагвалодаў камень. Дыскусіі пра яго цягнуліся некаторы час, аднак першае навуковае даследаванне было прадстаўлена ў газеце "Северная почта" Ягорам Францавічам Канкрыным. Па сваіх вывадах адносна прызначэння гэтых камянёў Канкрын вельмі блізка падыйшоў да вывадаў сучасных вучоных. Ён даў характарыстыку навакольнай мясцовасці, апісанне каменя, падрабязнае апісанне і характарыстыку надпіса, гіпотэзу аб прызначэнні камня, гістарычны экскурс- даследаванне аб тым, хто мог быць Рагвалод і таксама заключэнне аб непадробленасці камня.

Негледзячы на тое, што вывучэнне палеаграфіі пачалося менавіта з эпіграфічных помнікаў, першыя курсы палеаграфіі базіраваліс на матэрыялах рукапісаў, а не на эпіграфічным матэрыяле. Аднак і эпіграфічныя помнікі не былі забыты. Так, у работу І.І. Срезнеўскага "Древние памятники русского письма и языка X-XIV вв." и "Славяно-русская палеография" ук-лючаны не толькі рукапісныя помнікі, але і помнікі матэрыяльнай культуры з надпісамі, разглядаецца змест надпісаў і іх графіка. [15; 16]

Аднак ўсе часцей з'яўляецца думка, што надпісы на прадметах маюць свае спецыфічныя рысы і адрозніваюцца ад рукапісаў, таму не можа быць адзінай іх палеаграфіі. Гэтую думку ў пачатку ХХ стагоддзя развіваў І.А.Шляпкін, які вылучыў так званую рэчавую палеаграфію (па сутнасці тую ж эпіграфіку). [17] Але доўгі час эпіграфічны матэрыял так і застаецца толькі ілюстратыўным. Толькі з 1936 года пачынаецца сістэматычнае вывучэнне эпіграфікі А.С.Арловым. У яго рабоце "Библиография русских надписей" было апублікавана тлумачэнне 303 надпісаў ХІ-ХV стст. на розных прадметах, аднак без публікацыі арыгінаў тэкста. [11]

З іншага боку ў найбольш поўным аб'еме як поўнацэнная гістарычная крыніца даследаваліся эпіграфічныя помнікі ў працы Б.А.Рыбакова "Ремесло Древней Руси" [12]

Далей вывучэнне эпіграфікі вядзецца па двум напрамкам. У 60-70-я гады выходзяць даследаванні С.А.Высоцкага "Древнерусские надписи Софии Киевской" и "Средневековые надписи Софии Киевской" прысвечаныя надпісам-графіці на сценах Кіеўскага Сафійскага храма. Акрамя публікацыі надпісаў, тут даецца іх чытанне, робіцца палеаграфічны і гістарычны аналіз, таксама даецца методыка фіксацыі графіці шляхам прарысоўкі і фотаздымкі. [3; 4] Аналагічная работа па даследаванню графіці Наўгародскага Сафійскага сабора была зроблена А.А.Медынцавай, вынікі гэтай працы



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

апублікаваны ў кнізе “Древнерусские надписи Новгородского Софийского собора”. [10]

У тыя ж гады адбываецца пашырэнне аб'ема археалагічных даследаванняў. Выходзяць рад артыкулаў Л.В.Аляксеева, Б.А.Рыбакова, В.Л.Яніна і інш. прысвечаныя вывучэнню асобных помнікаў эпіграфікі.

Значны крок ў развіцці эпіграфічных даследаванняў быў зроблены Б.А.Рыбаковым, які на V Міжнародным кангрэсе славістаў вызначыў асноўныя праблемы эпіграфікі: даследаванне ранніх этапаў пісьменнасці, адмежаванне эпіграфікі ад палеаграфіі, прынцыпы датавання эпіграфічных крыніц і прывядзенне саміх крыніц ў сістэму. [13] Вынікам гэтага з'явіўся звод “Русские датированные надписи X-XV вв.” састаўлены Б.А.Рыбаковым. [14] Гэты звод стаў своеасаблівым лямантаром, якім карыстаюцца на сенняшні дзень вучоныя пры датаванні надпісаў. Новым словам ў эпіграфіцы стала таксама распрацаваная Б.А.Рыбаковым на аснове даследавання крыжа Еўфрасінні Полацкай методыка вызначэння датыроўкі помніка не па навейшых ці пазнейшых прыкметах, а па тых, што маюць найбольшую колькасць аналогій. І хаця на сенняшні час гэты метад не вельмі надзейны, як і ўсякі параўнальны, але ім карыстаюцца пры датаванні надпіса па палеаграфічных данных.

Апублікаванне эпіграфічных крыніц у Беларусі цесна звязана з планамерным археалагічным вывучэннем сярэдневяковых гарадзішч супрацоўнікамі сектара археалогіі, які быў створаны ў 1944 г. ў Інстытуце гісторыі АН БССР. На працягу гэтага часу археолагамі вывучаліся лакалізацыя, тапаграфія, а таксама і матэрыяльная культура старажытных гарадоў Беларусі IX-XIII стст. Вынікам гэтага з'явіліся манаграфіі П.Ф.Лысенкі “Берестье”, Я.Г.Звяругі “Древний Волковыск”, Г.В.Штыхава “Древний Полоцк”, якіх абавязкова асвятлялісь пытанні культуры насельніцтва, у тым ліку на выснове археалагічных знаходак з надпісамі, а таксама прылад для пісьма рабыліся вывады аб стане пісьменнасці ў данных гарадах. [5; 6; 18]

Кожная знаходка з надпісам з'яўляецца рэдкай і цікавай, таму ёсць шмат артыкулаў, прысвечаных адзінкавым знаходкам, так, напрыклад, як артыкул П.Ф.Лысенкі “Шиферное пряслице с надписью из Пинска” або М.В.Малеўскай “Амфора с надписью из Новогрудка”. [7; 8]

Найбольш поўнай работай па эпіграфіке на сенняшні дзень з'яўляецца манаграфія А.А.Медынцевай “Грамотность в Древней Руси”, дзе абагульняюцца і даследуюцца эпіграфічныя помнікі X-XIII ст.ст. [9] Аднак эпіграфічныя помнікі Беларусі ў ей амаль што не даследаваны (за рэдкім выключэннем, што датычыцца апублікаваных у савецкія гады матэрыялаў).

Склалася сітуацыя, калі назапашаны матэрыял патрабуе класіфікацыі, сістэматызацыі і абагульнення. Для гэтага існуе даволі вялікая база



апублікаваных крыніц. Але таксама ў наяўнасці шмат неапублікаваных матэрыялаў ў фондах музеяў Беларусі. Аналіз гістарыяграфіі разглядаемай праблемы дазваляе зрабіць выснову, што актуальная праблема вывучэння пісьміннасці насельніцтва Беларусі ў X-XIII стст. Па эпіграфічных данных не стала прадметам спецыяльнага даследавання. Вывучаліся толькі пэўныя аспекты яе гісторыі ў сувязі з археалагічнымі даследаваннямі гарадзішчаў на тэрыторыі Беларусі.

### Літаратура:


1. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в.–30-е гг. XXв. Мн., 1996.
2. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Мн., 1993.
3. Высоцкий С.А. Древнерусские надписи Софии Киевской. М., 1966.
4. Высоцкий С.А. Средневековые надписи Софии Киевской. М., 1976.
5. Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Мн., 1975.
6. Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1985.
7. Лысенко П.Ф. Шиферное пряслице с надписью из Пинска. СА, 1966, № 3.
8. Малевская М.В. Амфора с надписью из Новогрудка. СА, 1962, № 4.
9. Медынцева А.А. Грамотность в Древней Руси (по памятникам эпиграфики X- первой половины XIII в.). М., 2000.
10. Медынцева А.А. Древнерусские надписи Новгородского Софийского собора. М., 1977.
11. Орлов А.С. Библиография русских надписей XI-XVII.М.-Л., 1936.
12. Рыбаков Б.А. Ремесло Древней Руси. М.-Л., 1948.
13. Рыбаков Б.А. Русская эпиграфика X-XIV вв. (состояние, возможности, задачи): Доклад на V Международном съезде славистов. София, сент.1963 г.//История, фольклор, искусство славянских народов. М., 1963.
14. Рыбаков Б.А. Русские датированные надписи XI-XV вв. М., 1964.
15. Срезневский И.И. Древние памятники русского письма и языка X-XIV вв. СПб., 1863.
16. Срезневский И.И. Славяно-русская палеография. СПб., 1885.
17. Шляпкин И.А. Русская палеография. СПб., 1913.
18. Штыхов Г.В. Древний Полоцк X-XIII вв. IX-XIII вв. Мн., 1975.
19. Stryikowski M. Kronika Polska, Litewska, Zmodska i wszystkiej Rusi. MD XXXII. T. 1, 2.




РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ